Беларуская народная песня павінна стаць яго асновай, кожны народны калектыў, абапіраючыся на мясцовыя традыцыі народнай культуры, можа стаць непаўторным.

Такім чынам, асновай народна-харавога выканання павінна стаць паглыбленае вывучэнне традыцый народнага музычнага мастацтва, якое дазваляе пранікнуць у глыбіню народнага музычнага мыслення, не капіруючы яго стылёвыя рысы. Адным з важных метадаў асэнсавання асаблівасцей народнай музычна-харавой творчасці з'яўляецца аналіз яе лепшых узораў.

Аўтэнтычная народная песня пачынае займаць галоўнае месца ў рэпертуары народных харавых калектываў. Узрастае цікавасць да фальклору. Пачынаецца папулярызацыя дзіцячых і дарослых фальклорных калектываў. Значная роля ў гэтым належыць выпускнікам нашага універсітэта. З кожным годам павялічваецца колькасць народных хароў і ансамбляў. Расце іх выканальніцкі ўзровень.

Развіццё народнага мастацтва прад'яўляе да спецыяліста самыя сур'ёзныя патрабаванні. Веды будучых спецыялістаў не павінны абмяжоўвацца вывучэннем вузкаспецыяльных дысцыплін. Праца з калектывам патрабуе ад кіраўніка развіцця інтэлекту, эрудыцыі і мастацкага густу. І ў працэсе навучання спецыялістаў павінна ўлічвацца ўся разнапланавасць дзейнасці кіраўніка народнага харавога калектыву.

Поспех працы кіраўніка цалкам залежыць ад разумення ім заканамернасцей развіцця народнай музычнай творчасці, яе гістарычнай і дыялектычнай асноў. Кіраўніку трэба ўмець выкарыстоўваць вынікі комплекснага аналізу народнай песні. Таму развіццё ў студэнтаў аналітычнага мыслення павінна займаць адно з галоўных месц у падрыхтоўцы кіраўніка народна-харавога калектыву. Яно неабходна ў падборы і вывучэнні рэпертуару, яго запісу і расшыфроўцы, аранжыроўцы, а таксама ў сцэнічным увасабленні, ацэнцы выканальніцкага ўзроўню калектыву.

Без аналізу не можа быць глыбокага асваення народнай творчасці, яе рэалізацыі ў выканальніцкай практыцы. Развіццё навыкаў ана-лізу ў будучых-кіраўнікоў павінна здзяйсняцца на працягу ўсіх гадоў навучання.Галоўным аб'ектам у гэтым плане можа стаць народная песня. Яна з'яўляецца сінтэзам музыкі, слова, жэста, мімікі, танца. Таму для сцэнічнага ўвасаблення неабходны веды па музыцы, літаратуры, харэаграфіі, жывапісу. Пры сцэнічным увасабленні народнай песні патрабуецца таксама веданне законаў сцэны і сцэнічнага мастацтва.

Комплексны аналіз фальклорнага твора прадвызначае вывучэнне ўсіх сродкаў музычна-паэтычнай выразнасці паасобку, а таксама ва ўзаемасувязі.

На сённяшні дзень няма дапаможнікаў па аналізе сцэнічнага ўвасаблення народнай песні. Іх распрацоўка з'яўляецца асновай ва ўдасканаленні сістэмы падрыхтоўкі кіраўнікоў народных хароў.

Значэнне развіцця навыкаў аналізу народнай песні цяжка перабольшыць. Аналіз дапамагае ўдумліва і творча адносіцца да народнай творчасці, вучыцца цаніць і разумець народную песню. Аналізуючы і даследуючы яе традыцыі, сувязь з сучаснасцю, мы праяўляем клопат аб будучыні беларускай народнапесеннай культуры.

Жылінская Н.П.,
выкладчык

## КАЛЯНДАРНЫЯ ТРАДЫЦЫІ ПЕСЕННАГА ФАЛЬКЛОРУ І ПРАКТЫЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ СТУДЭНТАЎ

У працэсе выкладання дырыжорска-харавых дысцыплін песні каляндарна-земляробчага круга з'яўляюцца цікавым вучэбным матэрыялам і займаюць вядучую ролю ў вывучэнні традыцыйнага песеннага фальклору. Гэта старажытны гісторыка-стылёвы пласт. Названыя песні цесна звязаны з той ці іншай парой года і выконваюць пэўную функцыянальную нагрузку. У залежнасці ад пары года яны падзяляюцца на зімовыя, веснавыя, летнія, восеньскія.

У аснове вызначэння жанру каляндарных песень ляжыць функцыянальная прымета: гэта калядкі, шчадроўкі, гуканне вясны, масленічныя, валачобныя, юр'еўскія, траецкія, жніўныя, русальныя, карагоды, купальскія, дажыначныя,ярныя ("як жнуць ярыцу").

У гадавым крузе народных свят і земляробчых абрадаў, вакол якіх групіраваліся традыцыйныя каляндарныя песні, на першым плане -



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- Каляды. У беларускім каляндарным фальклоры Каляды азначаюць зімовыя традыцыйныя святы.

У цэнтры гэтага абраду абавязкова былі абходныя песні - "каляды", "шчадроўкі".

Да зімовага песеннага цыкла адносяцца хараводныя і гульнявыя песні, якія з'яўляюцца часткай калядных гульняў (яны складалі другую групу зімовых песень). Як прыклад можа быць паўночна-беларуская калядная гульня "Жаніцьба Цярэшкі", а таксама гульні "Яшчук", "Халімон", "Зязюля", "Гусары", калядныя хараводы "Заінька", "Падушачкі", "Грушка".

Трэцюю групу зімовых песень складалі піліпаўскія (або мікольскія), якія выконваліся звычайна ў хатах і былі папярэднікамі калядных зімовых песень. Гэтыя песні спяваліся ў доўгія вечары піліпаўскага посту, калі жанчыны бралі з сабою пралкі і збіраліся ў адной хаце.

Самы працяглы па часе і самы разнастайны па абраднасці і песенных жанрах - веснавы перыяд. Да яго адносяцца масленічныя песні, песні гукання вясны, валачобныя, юр'еўскія, траецкія, русальныя і інш.

Веснавыя абходы хат і двароў у беларускім песенным календары пачынаюцца з песень валачобнікаў. Відавочна гістарычная сувязь гэтых песень з абходнымі калядкамі па змесце, значэнню, па стылевых прыметах.

Далей у веснавым цыкле значнае месца адводзіцца юр'еўскім песням. Юр'еўскае свята звязана з выганам скаціны на "юр'еўскія росы".

На стыку сустрэчы вясны і лета -- траецкія і русальныя песенныя абрады. Нельга разглядаць веснавы цыкл без карагодаў, яны -- неад'емная яго частка. Пачынаецца веснавы цыкл карагодам "Проса" ("А мы проса сеялі, сеялі") і заканчваецца карагодам "Страла" ("Ой, пушчу стралу па сялу, сялу").

Асобную групу веснавога цыкла складаюць разнастайныя лірычныя і апавядальныя песні, умоўна прымеркаваныя да веснавога часу. Гэта лугавыя, палявыя, лясныя.

Летні песенны цыкл уключае святы Купалле, Жніво. Ядро жніўнага цыкла склалі найбольш значныя ў беларускай каляндарнай традыцыі працоўныя жніўныя песні. Гэта абрадавыя, зажыначныя і дажыначныя песні.

Своеасаблівы восеньскі цыкл каляндарнага фальклору. У ім шмат працоўных палявых песень, а таксама лірычных. Яго лічаць самым лірычным сярод усіх каляндарных цыклаў, нягледзячы на жанрава-тэматычную разнастайнасць песень, якія сугучны з характарам восеньскай прыроды. Найбольш цікавыя песні гэтага цыкла "Як жнуць ярыцу", "Як лён ірвуць", "Як убіраюць грэчку", а таксама святы "Свята восеньскага Юр'я", "Вялікія дажынкі", якія святкуюцца пасля ўборкі ўраджаю.

Каляндарна-песенны фальклор дае магчымасць студэнтам уявіць быт і светаўспрыманне папярэдніх пакаленняў, пазнаёміцца з іх традыцыямі, зместам, асаблівасцямі абрадаў. Гэта ў сваю чаргу дапамагае сцэнічнаму ўвасабленню фальклорнага матэрыялу.

Жарава Д.І.,
выкладчык

## ФАРМІРАВАННЕ МАСТАЦКА-ВОБРАЗНАГА МЫСЛЕННЯ АСОБЫ СРОДКАМІ МУЗЫКІ

Мысліцеляў здаўна займала ідэя аб сэнсе і прызначэнні музыкі, аб яе ролі ў жыцці чалавека, у выхаванні асобы. Пры дапамозе музычнага інструмента, у гучанні якога факусіруецца нябесная гармонія, можна настроіць і душы асоб, якія слухаюць музыку. Іменна гэтым вылечваюцца іх нервы, душа вызваляецца ад афектаў (гневу, пажадлівасці, страху і г.д.), чалавеку вяртаецца яго пачатковая гарманічнасць. Паводле Арыстоцеля, грамадства само павінна быць заклапочана гарманічным развіццём сваіх грамадзян, паколькі чалавек ёсць істота сацыяльная.

Разглядаючы праблему музычнага выхавання асобы, мы выдзяляем некалькі функцый музыкі. Хочацца падкрэсліць яе ролю ў фізіялагічным уздзеянні на чалавека і яго маральным выхаванні.

На працягу апошніх паўтара вякоў пастаянна ўзмацняецца тэндэнцыя да скарачэння тэрміну фізічнага выспявання (працэс акселерацыі). У выніку гэтага адбываецца некаторае адставанне маральна-псіхалагічнай і сацыяльнай сталасці маладога чалавека, што ўносіць у "пераходны" ўзроставы перыяд адносную дысгарманічнасць. Своеасаблівае рэгуляванне паміж дэфіцытам духоўнай сталасці і фізічным выспяваннем у многім выконвае мастацтва. Усякае мастацтва адлюстроўвае рэчаіснасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ